МГПУ им. И.П.Шамякина

**В. П. Шаўчэнка, М. М. Шаўчэнка** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫЁМУ СУПАСТАЎЛЕННЯ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ

Якім павінен быць сучасны ўрок у школе? Гэта пытанне хвалюе кожнага настаўніка-славесніка. Яно звязана з тым, што літаратура ў большай меры, чым іншыя школьныя прадметы задавальняе патрабаванні духоўнага і эстэтычнага выхавання, развіцця камунікатыўных навыкаў і ўменняў школьнікаў. Абумоўлена гэта прыродай мастацкага слова, здольнага цэласна, шматаспектна ўздзейнічаць на асобу чалавека, фарміраваць яго інтэлект, пачуцці, волю, светабачанне

і светаадчуванне, адкрываць шырокі свет грамадскіх маральна-этычных і мастацка-эстэтычных каштоўнасцей.

Выкарыстанне новых навучальных тэхналогій яшчэ не гарантуе поспеху. Самае важнае – настаўніцкая ініцыятыва, уменне падабраць ключык да кожнага з вучняў.

Адным з важнейшых накірункаў працы на ўроку з'яўляецца аналіз літаратурнага твора, мэта якога – "паглыбіць і пашырыць першапачатковае ўспрыманне тэксту, зрабіць больш асэнсаваным і мэтанакіраваным, навучыць вучняў славесна афармляць свае ўражанні, фарміраваць чытацкія ўменні, развіваць культуру чытання. Аналіз твора ў школе павінен абудзіць і развіваць крытычную думку, самастойнасць мыслення, уменне прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы, супастаўляць, параўноўваць, выпрацоўваць навык падыходзіць да ацэнкі грамадскіх і літаратурных з'яў" [3, с. 110].

Але, як паказвае практыка, прачытаўшы мастацкі твор, вучні якраз сутыкаюцца з праблемай яго аналізу. Вядома, што цэласны аналіз мастацкага твора ўключае ў сябе некалькі этапаў, на адным з якіх разглядаецца сістэма вобразаў. Асноўным шляхам аналізу з'яўляецца супастаўленне эпізодаў, сцэн, асэнсаванне ўчынкаў і дзеянняў герояў. Гэта і з'яўляецца праблемай, таму што вучні засвойваюць элементарную для ўсіх схему аналізу, якая не можа раскрыць галоўныя каштоўнасці твора, ідэйна-эстэтычны змест вобразаў-персанажаў у параўнанні з іншымі. А гэта ў першую чаргу звязана з начыткай, якая ў цяперашніх школьнікаў амаль адсутнічае (акрамя твораў у скарочаным варыянце, якімі забіты паліцы кніжных лавак), і зноў жа – непасрэдна з асобай настаўніка.

Узнікае пытанне: як актывізаваць дзейнасць вучняў, як той ці іншы прыём аналізу мастацкага твора можа садзейнічаць актывізацыі выхавання на сучасным уроку, важнейшай умовай якой з'яўляецца абуджэнне творчай актыўнасці вучня, прагі пазнання, пачуцця прыгажосці, унутранай патрэбы адчуваць роднае слова, захапляцца ім, перажываць, тварыць прыгожае?

У школьнай практыцы выдзяляецца шмат прыёмаў і метадаў аналізу мастацкага твора. У кожным канкрэтным выпадку шляхі, метады, прыёмы аналізу абумоўліваюцца адметнасцю, непаўторнасцю ідэйнага зместу твора, спецыфікай жанру, своеасаблівасцю індывідуальнага стылю, узроставымі асаблівасцямі вучняў, іх літаратурнай падрыхтоўкай, уменнем весці дыялог і дыскусію, супастаўляць вобразна-мастацкія сродкі мовы.

Інтэрактыўную дзейнасць вучняў на ўроку можна павысіць, калі выкарыстаць прыём супастаўлення. Цікава звярнуцца да тэмы, якая аб'ядноўвае творы Я. Лучыны і І. С. Тургенева, – прырода ў мастацкім асэнсаванні пісьменнікаў. У розныя часы і з рознай нагоды пакідалі мастакі слова свае ўражанні аб прыродзе. Кожны школьнік можа ўзгадаць наступныя словы Я. Коласа аб роднай старонцы:

МГПУ им. И.П.Шамякина

*Мой родны кут, як ты мне*
*мілы! Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны маёй убогай, К*
*табе я ў думках залятаю І там*
*душою спачываю* [1, с. 7].

Не складаюць выключэнне творы Я. Лучыны “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся” і “Запіскі паляўнічага” І.С. Тургенева, у якіх аўтары выступаюць сапраўднымі майстрамі ў паказе прыроды роднага краю.

Прырода ў паэме Я. Лучыны прадстаўлена як тыповыя абставіны жыцця чалавека:

*Прыгожы, некрануты край перада мною,*
*Чарот бязмежны, пушча з сіняй глыбінёю,*
*Дзе хвой выносістых завершаны стажок,*
*Як галаву, траха пасерабрыў сняжок, А*
*побач клён раскошны...* [2, с. 52].

*Нібыта стужка, лес наперадзе далёка*
*Раскінуўся, абняўшы небакрай шырока.*
*А жнівеньскае сонца прыспарала жар,*
*Блакітны промнямі выбельвала абшар* [2, с. 57].

*Вось волат-дуб, над гуртам дрэў дасяг ён хмар.*
*Разложысты. Наўкол дзяржавец-валадар*
*Забраў вялікую прастору ад суседзяў.*
*Пры ім, пад ім жывуць, існуюць зараз ледзьве*
*Гатункаў розных карлікі – падданцы ўсе Манарха,*
*прышласць ім надзей не прынясе* [2, с. 59].

Вуснамі свайго героя Я. Лучына пратэстуе супраць вынішчэння прыроды, звязаных з гэтым перамен ва ўзаемаадносінах людзей:

*Спусцее Паграбішча, пойдзе ўсё на звод, І*
*ў Муты схоча ліпкі на прыбыткі зброд,*
*Пакуль не выссуць сокаў, бы кляшчы з*
*зямелькі, Да ніткі абскубуць... Як рады дасць*
*тады Жыхар, якога жывяць Чорныя Ляды,*
*Калі за венік нават, што цяпер дармовы,*
*Плаціць павінны грошы* [2, с. 47].

З вялікім клопатам пра зберажэнне гэтага цэласнага свету-сусвету і памірае стары ляснік Грышка.

*Калі б мне Бог шчэ раз*
*Пражыць мой век дазволіў,*
*Было б ужо няміла, Другі*
*стаў свет!* [2, с. 91].

З вялікай любоўю і на самой справе па-майстэрску І. С. Тургенеў апісвае ў “Запісках паляўнічага” родную прыроду. Гэтыя апісанні

МГПУ им. И.П.Шамякина

сустракаюцца практычна на кожнай старонцы твора, а як без гэтага, калі паляванне адбываецца ў такіх жывапісных мясцінах: *"Солнце село, но в лесу еще светло, воздух чист и прозрачен; птицы болтливо щебечут; молодая трава блестит веселым блеском изумруда... Лесной запах усиливается, слегка повеяло теплой сыростью; влетевший ветер около вас замирает..."* [4, с. 12]. І. С. Тургенеў у сваім творы паказвае родную прыроду больш дэталёва, у асноўным гэта залежыць і ад разнавіднасці жанру, і ад умення перадаць чытачу ўласныя назіранні. Вось як апісвае аўтар ноч: *"Месяц взошел наконец; я его не тотчас заметил: так он был мал и узок. Эта безлунная ночь, казалось, была все так великолепна, как и прежде. Но уже склонились к темному краю земли многие звезды, еще недавно высоко стоявшие на небе; все совершенно затихло кругом, как обыкновенно бывает все только к утру: все спало крепким, неподвижным, предрассветным сном..."* [4, с. 71].

Любая з'ява прыроды знаходзіць сваё мастацкае адлюстраванне на старонках "Запісак паляўнічага" І. С. Тургенева: *"Гроза надвигалась. Впереди огромная лиловая туча медленно поднималась из-за леса; надо мной и мне навстречу неслись длинные серые облака; ракиты тревожно шевелились и лепетали..."* [4, с. 108]. Апісанне прыродных з'яў у творы падаецца непаспешліва і паслядоўна: *"сильный ветер внезапно загудел в вышине, деревья забушевали, крупные капли дождя резко застучали, зашлепали по листьям, сверкнула молния и гроза разразилась..."* [4, с. 108].

Паказальным у плане апісання роднай прыроды можна лічыць апавяданне з цыклу "Запісак паляўнічага" І. С. Тургенева, якое закрывае цыкл і мае эпіграф:

*И понемногу начало назад Его*
*тянуть: в деревню, в темный сад,*
*Где липы так огромны, так тенисты,*
*И ландыши так девственно душисты,*
*Где круглые ракиты над рекой С*
*плотины наклонились чередой...*
*Там хорошо...* [4, с. 248].

Наогул, увесь цыкл апавяданняў "Запіскі паляўнічага" І. С. Тургенева пранізаны пейзажнымі замалёўкамі. Чытаючы гэты твор, мы можам уявіць і палюбавацца ўзыходам сонца і летняй раніцай, пачуць спеў птушак, пабываць на пясчаным беразе і квітнеючым лузе, пачуць шум бору, шапаценне кожнага лісточку на дрэве.

Літаральна ў кожным апавяданні І. С. Тургенеў вядзе гаворку і паказвае тую сілу, якую мае над чалавекам прырода. Адчуванне гэтай сілы і нараджае пачуццё вялікай еднасці з прыродай, якая аб'ядноўвае беларускіх і рускіх паляўнічых.

У наш час неабходна з вялікай адказнасцю ставіцца да ўсяго навакольнага, зрабіць кожны куточак зямлі лепшым, прыгажэйшым.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Хараство прыроды павінна радаваць не толькі нас, але і нашых нашчадкаў. Прырода сёння не можа выстаяць перад нястрымным наступам тэхнікі. Яна патрабуе абароны. А абараніць прыроду – значыць абараніць жыццё, абараніць Радзіму.

Вывучаючы творы Я. Лучыны і І. С. Тургенева неабходна, каб вывады і разважанні школьнікаў пры выкарыстанні супастаўляльнага аналізу падмацоўваліся прыкладамі з тэксту, што будзе развіваць уменні і навыкі, неабходныя для глыбокага разумення сутнасці вобразаў твораў. Замацаваць гэта можна прапановай напісаць сачыненне-мініяцюру ці скласці тэзісы або план-характарыстыку на пэўных герояў. Сачыненні-водзывы ў гэтым выпадку дапамогуць развіваць навыкі самастойнай ацэнкі ў выніку супастаўленняў, актывізаваць індывідуальны пошук і творчыя здольнасці.

Вучні павінны зразумець, што адлюстраваныя ў творы нацыянальныя традыцыі, характар, побыт, прырода не проста перадаюць этнакультурныя асаблівасці таго ці іншага народа, а знаходзяць выражэнне ў творчай індывідуальнасці пісьменніка, у створаным ім мастацкім свеце, у яго канцэпцыі жыцця і чалавека.

Так як вучні 9 класа ўжо маюць свой асабісты погляд, могуць выказваць свой пункт гледжання, задача настаўніка пры аналізе зместу твораў – звярнуць увагу на асобу аўтараў, іх погляды на дабро і зло, на высокае і нізкае. Гэтым настаўнік заахвоціць вучняў параўнаць асабістыя погляды і ацэнкі з поглядамі і ацэнкамі пісьменніка.

Выкарыстаўшы супастаўляльны прыём аналізу твораў Я. Лучыны і І.С. Тургенева, вучні павінны прыйсці да высновы, што ў беларускай і рускай літаратуры канца XIX стагоддзя даволі грунтоўна распрацавана тэма палявання, створаны шматгранны вобраз паляўнічага. Прыём супастаўлення выявіць шэраг не толькі падобных матываў і вобразаў, але і істотныя адрозненні ў жыцці, менталітэце, побыце паляўнічых, што гаворыць аб самабытнасці кожнай з літаратур, спецыфіцы характару беларускага і рускага народаў.

Такім чынам, выкарыстанне прыёму супастаўлення на ўроках літаратуры актывізуе пошукавы спосаб засваення новага матэрыялу, дапамагае глыбей зразумець ідэйна-эстэтычны змест вывучаемых твораў, а настаўнік, які выкарыстоўвае на сваіх уроках прыём супастаўляльнага аналізу, павінен валодаць неабходнымі тэарэтычнымі ведамі па прымяненню дадзенага прыёма з улікам узроставых асаблівасцей вучняў, неабходнасцю вырашэння пэўнай вучэбна-выхаваўчай задачы. Творы, якія настаўнік выбірае аб’ектам супастаўляльнага аналізу, павінны грунтавацца на цэласным адзінстве і ўзаемасувязі нацыянальных і агульначалавечых мастацкіх каштоўнасцей, што дазваляе вучням па-новаму глянуць на родную літаратуру, ацаніць яе эстэтычную адметнасць у параўнанні з іншымі літаратурамі.

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Літаратура**

1. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск, 1974. – Т. 6.

2. Лучына, Я. Творы: вершы, нарысы, перакалады, лісты / Я. Лучына. – Мінск, 1988.

3. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэб. дапам. / Л.В. Асташонак [і інш.] / пад рэд. В. Я. Ляшук. – Мінск, 2002.

4. Тургенев, И. С. Записки охотника / И. С. Тургенев. – М., 1985.

МГПУ им. И.П.Шамякина